## “Толькі памятай маю цеплыню…”

Малая радзіма **Алы Нікіпорчык** — жывапісны куток Гродзеншчыны, вёска Капці Дзятлаўскга раёна. У 1979 годзе Ала Дзмітрыеўна скончыла філалагічны факультэт БДУ, працавала настаўніцай у сельскай школе. Адкрывала сваім вучням духоўны, захапляючы свет літаратуры і пісала сама. Не пакінула яе творчае натхненне і пасля пераезду ў абласны цэнтр. Зараз Ала Дзмітрыеўна працуе ў Гродзенскім абласным аддзяленні Саюза пісьменнікаў Беларусі. Упершыню землякі змаглі патрымаць у руках яе зборнік вершаў “Сляза і малітва” ў 2006 годзе. А праз год выйшаў яшчэ адзін “Пад бахаўскую такату дажджу”. Па запрашэнні Цэнтра беларускай культуры ў складзе дэлегацыі пісьменнікаў Гродзеншчыны яна неаднаразова наведвала Польшчу, дзе выступала перад студэнтамі-філолагамі Беластокскага ўніверсітэта і навучэнцамі беларускага ліцэя ў Гайнаўцы. Была таксама ўдзельнікам III Міжнароднага фестывалю рускай паэзіі, які адбыўся два гады таму ў Брэсце У 2010 годзе ёй была прысуджана Прэмія аблвыканкама імя Аляксандра Дубко “За творчыя дасягненні ў галіне культуры і мастацтва” ў намінацыі “Пісьменнік года” за кнігу “На грани — счастья” куды ўвайшлі вершы розных гадоў, напісаныя на рускай мове. Гэта глыбока пранікнёныя словы аб вечным: каханні, разважанні аб сэнсе жыцця чалавека. У аснове вершаў Алы Нікіпорчык — думка, уражанне, далікатныя рухі душы.
Прэмія - надзвычай пачэсная ўзнагарода сярод творчай інтэлігенцыі рэгіёна. Упершыню яна была прысуджана ў 2001 годзе. За гэты час яе лаўрэатамі сталі дзесяткі таленавітых людзей Прынёманскага краю. Гэты ганаровы спіс па праву папоўніла імя гродзенскай паэтэсы, уражэнкі нашай дзялаўскай зямлі.

**Леанарда Станіславаўна Юргілевіч** нарадзілася 4 верасня 1948 года ў в. Рагалеўшчына Валожынскага раёна. Бацькі былі калгаснікамі. Рана засталася сіратою. Спачатку вучылася ў Іўеўскай , а пасля ў Свіслацкай школах-інтэрнатах. У 1966 годзе прыехала ў Дзятлава, пачала працаваць у раённай газеце “Перамога”. Многія людзі, якія сустракаліся Леанардзе

Станіславаўне на яе жыццёвым шляху, станавіліся прататыпамі герояў яе апавяданняў, гумарэскаў, фельетонаў.

У 2000 г. у серыі “Бібліятэка “Вожыка” пабачыла свет яе першая кніжка гумарэсак “Грэшная душа”. Некалькі разоў наша зямлячка станавілася лаурэатам часопіса “Вожык”. Была удзельніцай Усебеларускага фестывалю сатыры і гумару “Аўцюкі – 2000”, дзе атрымала дыплом “За развіццё традыцый беларускага гумару”. Зараз Леанарда Станіславаўна на заслужаным адпачынку, але актыўная ўдзельніца ўсіх літаратурных мерапрыемстваў.

**Малько (Ігнатава) Алена Міхайлаўна** нарадзілася ў 1960 годзе ў Ноўгарадскай вобласці Расійскай Федэрацыі. Пазней бацькі пераехалі ў Беларусь. У 1977 годзе скончыла СШ №1г. Дзятлава і паступіла ў Гродзенскае музпедвучылішча, пасля заканчэння якога працавала выхавацелем у дзіцячым садзе г. Ліды. Адпрацаваўшы 2 годы, пераехала ў г. Гомель. З 1982 пастаянна жыве ў Дзятлаве, працавала да 2011 года выхавацелем у дзіцячым садзе №1. Зараз на заслужаным адпачынку.

Свой першы верш напісала ў 9 гадоў.

Алена Міхайлаўна – член літаратурнага аб’яднання “Пралескі”, сваімі настаўнікамі лічыць леанарду Юргілевіч і Яўгена Матвеева.

У 1988 годзе была запрошана Саюзам пісьменнікаў на сустрэчу маладых талентаў, якая праходзіла ў Валожынскім раёне, дзе выступаў Ніл Гілевіч.

Марыць аб выданні зборніка вершаў, якіх ужо напісана больш сотні.